# ГУЛЬНЯ-ПАДАРОЖЖА «Я ПАЗНАЮ БЕЛАРУСЬ»

## Выхаванне ў вучняў патрыятызму і цікавасці да падзей гераічнага мінулага беларусаў



**А. А. Дубовік,**
настаўнік пачатковых класаў
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
СШ аг. Пагранічны Берастaвіцкага раёна

**Адна з найважнейшых задач сістэмы адукацыі заключаецца ў тым, каб разам з развіццём пазнавальнай актыўнасці садзейнічаць фарміраванню ў вучняў каштоўнасных адносін да значных падзей мінулага і сучаснасці. На ўзроўні кожнай школы гэта задача актуалізуецца наступным чынам: настаўнік павінен не толькі на ўроках тлумачыць дзецям асаблівасці гістарычных працэсаў, але і падчас пазавучэбнай работы арганізоўваць вывучэнне і наведванне «месц памяці» – тых матэрыяльных і нематэрыяльных аб'ектаў, што з'яўляюцца сімваламі нацыянальнай спадчыны.**

У працэсе рэалізацыі інавацыйнага праекта ў нашай школе стала традыцыйным сістэматычнае правядзенне мерапрыемстваў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Адно з іх – **гульня-падарожжа «Я пазнаю Беларусь»** для вучняў 4–5 класаў.

**Мэта гульні:** выхаванне ў дзяцей патрыятызму і павагі да гераічнага мінулага беларускага народа.

**Задачы:** фарміраваць у вучняў эмацыянальна-каштоўнасныя адносіны да гістарычнай і культурнай спадчыны беларусаў, абагульніць веды навучэнцаў пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, арганізаваць сумесную дзейнасць школьнікаў.

**Папярэдняя работа:** некалькі вучняў рыхтуюць паведамленні пра мемарыяльныя комплексы «Брэсцкая крэпасць-герой», «Хатынь» і «Чырвоны Бераг», вучаць на памяць вершы пра вайну, падбіраюць на гэту тэму фотаздымкі.

**Ход гульні-падарожжа**

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

Настаўнік вітае ўдзельнікаў мерапрыемства, паведамляе яго тэму, мэты і задачы, прапануе абмеркаваць радкі з верша В. Вярбы, узятыя ў якасці эпіграфа:

*Высока ў небе вырай кружыць,*
*Ляціць за сіні небакрай.*
*Не забывай ніколі, дружа,*
*Сваю зямлю, свой родны край.*

Дзеці дзеляцца на каманды па 5–6 чалавек, разглядаюць кросенс з ключавым словам «Беларусь», вызначаюць назву краіны, па якой будзе ажыццяўляцца завочнае падарожжа, і называюць яе сімвал – гэта бусел (яго заданні неабходна будзе выконваць падчас наведвання станцый).

**II. Асноўны этап**

**Настаўнік.** Нашу краіну называюць краем блакітных азёр і зялёных лясоў. Расправіўшы белыя ветразі крылаў, лунаюць над Беларуссю буслы, нібыта закрываючы яе ад усіх нягод. Таму пра нашу краіну гавораць яшчэ і так: зямля пад белымі крыламі.

❑ **Станцыя «Мая Радзіма»**

**Заданне.** Растлумачце, як прыведзеныя прыметнікі характарызуюць Беларусь (за кожны адказ – 1 бал).

***Прыметнікі:*** сінявокая *(на тэрыторыі Беларусі шмат рэк і азёр, у палях квітнеюць сінія васількі)*; добразычлівая *(беларусы – народ прыязны і гасцінны)*; лясная *(большая частка краіны пакрыта лясамі, пушчамі, барамі)*; працавітая *(у Беларусі жывуць працавітыя людзі)*; майстравая *(рэспубліка славіцца сваімі рамёствамі і промысламі: тут ёсць бандарнае, ганчарнае, кавальскае рамёствы, дэкаратыўны роспіс, іканапіс, лозапляценне, саломапляценне, ткацтва, разьба па дрэве)*; шчодрая *(беларуская зямля кожны год дорыць багаты ўраджай гароднiны і садавіны, ягад і грыбоў)*; талерантная *(тут жывуць мірныя людзі, якія маюць шмат сяброў)*;